ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай установы “Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры”
Г.У.Сафронава
__________ 2023 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзенні дыстанцыйнага гарадскога конкурсу дзіцячай эстраднай творчасці “Сем вясёлкавых нот”

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак правядзення дыстанцыйнага гарадскога конкурсу дзіцячай эстраднай творчасці “Сем вясёлкавых нот” (далей Конкурс).
2. Мэтамі і задачамі Конкурсу з’яўляюцца: рэалізацыя мастацкага патэнцыялу таленавітых дзяцей і падлеткаў; удасканаленне выканальніцкага майстэрства дзеючых калектываў; папулярызацыя эстраднага песеннага і харэаграфічнага жанраў; павышэнне выканальніцкага майстэрства і ўзроўню сцэнічнай культуры; далучэнне таленавітай моладзі да эстраднага мастацтва.
3. Арганізатарам Конкурсу з’яўляецца дзяржаўная ўстанова “Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры”.
4. Графік правядзення Конкурсу:
- з 20 сакавіка па 21 красавіка 2023 года (уключна) — прыём заявак;
- 6 мая 2023 года — падвядзенне вынікаў;
- 19 мая 2023 года — канцэрт лаўрэатаў.
5. Да ўдзелу ў Конкурсе дапускаюцца дзіцячыя калектывы (вакальныя, харэаграфічныя), асобныя выканаўцы (вакал, танец), індывідуальныя выканаўцы размоўнага жанру (прадстаўнікі студый устаноў адукацыі, дзіцячых музычных школ, дзіцячых школ мастацтваў, цэнтраў творчасці дзяцей і моладзі горада Гродна).
6. Конкурс праводзіцца па намінацыях:
саліст-вакаліст;
вакальны дуэт;
вакальны ансамбль (гурт, калектыў);
танцавальны калектыў;
размоўны жанр (самапрэзентацыя).
Для ўдзельнікаў Конкурсу вызначаюцца тры ўзроставыя групы: малодшая, сярэдняя, старэйшая — для кожнай намінацыі.

Малодшая ўзроставая група — ўдзельнікі ва ўзросце ад 5 да 8 гадоў уключна;
сярэдняя ўзроставая група — ад 9 да 12 гадоў уключна;
старэйшая ўзроставая група — ад 13 да 14 гадоў уключна.

7. Канкурсанты рыхтуюць да выканання эстрадныя нумары:
салісты, вакальныя ансамблі — 1 вакальны нумар;
харэаграфічныя калектывы — 1 харэаграфічны нумар;
выканаўцы размоўнага жанру — самапрэзентацыю.
Працяг відэа конкурснай праграмы для салістаў, вакальных ансамбляў, харэаграфічных калектываў павінен складаць не больш чым 4 хвіліны. Працяг відэа конкурснай праграмы для выканаўцаў размоўнага жанру павінен складаць не больш чым 5 хвілін.

8. Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:
- адпаведнасць мэтам і задачам конкурсу;
- выканальніцкае майстэрства;
- мастацка-эстэтычны ўзровень рэпертуару;
- якасць аранжыроўкі і фанаграм;
- мастацкае афармленне нумару (касцюм, рэжысура);
- арыгінальнасць выканання, артыстызм;
- сцэнічная культура і культура мовы.

9. Да ўдзелу ў Конкурсе неабходна да 21 красавіка 2023 года запоўніць заяўку ў электронным выглядзе:
**сылка: https://docs.google.com/forms/d/e/1FAIpQLSf97NpEx91O9DEIvtDwdD-splYgesD12t6Wh3KRCRpLDYV68g/viewform.**
Або ў папяровым варыянце (Дадатак 1), адсканаваную заяўку і відэаматэрыял з творчым нумарам выступлення адправіць на электронны адрас **sem.not21@mail.ru**.
Даведкі па тэлефонам: 8(0152)682062, 8(0152)682078.

10. Пераможцы Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата I, II, III ступеняў, прызамі, і прымуць удзел у заключным канцэрце, які адбудзецца 19 мая 2023 года па адрасе: вул. Дзяржынскага, 1, г.Гродна, канцэртная зала дзяржаўнай установы “Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры”.

11. У спецыяльных намінацыях Конкурсу:
“За ўдалы дэбют”;
“За лепшы аўтарскі твор”;
“За акцёрскае майстэрства”;
“За лепшую пастаноўку харэаграфічнага нумару”.
Дыпломамі ўдзельніка ўзнагароджваюцца канкурсанты, не заняўшыя прызавых месцаў.
Журы пакідае за сабой права змяняць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

Вынікі конкурсу будуць размешчаны 11 мая 2023 года на сайце дзяржаўнай установы “Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры” **ckg.by**.

12. Арганізатары Конкурсу захоўваюць неабмежаванае права на запіс і распаўсюджванне выступлення калектываў, выканаўцаў рознымі тэхнічнымі сродкамі.

13. Фінансаванне выдаткаў на правядзенне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў гарадскога бюджэту прадугледжаных у каштарысе дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры». Для фінансавання Конкурсу могуць быць выкарастаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Дадатак 1**
да інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні дыстанцыйнага гарадскога конкурсу дзіцячай эстраднай творчасці “Сем вясёлкавых нот”

ЗАЯЎКА
на ўдзел у дыстанцыйным гарадскім конкурсу дзіцячай эстраднай творчасці “Сем вясёлкавых нот”

1. Намінацыя
2. Узроставая катэгорыя (дата нараджэння)
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка (альбо поўная назва калектыву)
4. Месца вучобы ўдзельніка (база дзейнасці калектыву)
5. Колькасць удзельнікаў
6. Узрост удзельнікаў калектыву
7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка
8. Серыя і нумар пашпарту кіраўніка, хатні адрас, кантактны тэлефон
9. Назва нумару
10. Прозвішча, імя аўтара музыкі і слоў
11. Прозвішча, імя, імя па бацьку харэографа-пастаноўшчыка
12. Кароткая творчая характарыстыка ўдзельніка або калектыву (абавязкова)

***Пацвярджаю, што азнаёмлены (а) з палажэннямі Закона Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021г. № 99-З "аб абароне персанальных дадзеных", а таксама правамі і абавязкамі ў вобласці абароны персанальных дадзеных.***

_____________________ (подпіс)

_____________________ (Ініцыялы, фамілія)